У АБСТАНОЎЦЫ АДНАДУШНАСЦІ

Сустрэча таварыша К. Т. МАЗУРАВА з выбаршчыкамі

Мінскі Акруговы Дом афіцэраў. Сюды 20 мая на сустрэчу з кандыдатам у дэпутаты Савета Саюза Вярхоўнага Савета СССР па Мінскай гарадской першай выбарчай акрузе членам Палітбюро ЦК КПСС, першым намеснікам Старшыні Савета Міністраў СССР Кірылам Трафімавічам Мазуравым сабраліся прадстаўнікі заводаў і фабрык, навучальных і іншых устаноў.

Сход адкрыў першы сакратар Мінскага гаркома КПБ Л. П. Мятліцкі.

У прэзідыуме член Палітбюро ЦК КПСС, першы намеснік Старшыні Савета Міністраў СССР К. Т. Мазураў, кандыдат у члены Палітбюро ЦК КПСС, першы сакратар ЦК КПБ П. М. Машэраў, Старшыня Савета Міністраў БССР Ц. Я. Кісялёў, Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР В. І. Казлоў, сакратары ЦК КПБ С. А. Пілатовіч, С. О. Прытыцкі, Ф. А. Сурганаў, Д. Ф. Філімонаў, старшыня рэспубліканскага Савета прафсаюзаў І. М. Макараў, першы сакратар Мінскага абкома КПБ І. Я. Палякоў, старшыня Камітэта народнага кантролю БССР А. А. Смірноў, намеснікі Старшыні Савета Міністраў БССР І. Ф. Клімаў, П. Л. Коханаў, кіраўнік брыгады камуністычнай працы завода імя Мяснікова С. А. Бірыла, цясляр будтрэста № 4 М. І. Гайдук, рэктар Беларускага Дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна А. Н. Сеўчанка, настаўніца школы № 14 заслужаная настаўніца школы БССР В. І. Рузава і іншыя.

Слова атрымлівае даверана асоба — галоўны інжынер будтрэста № 15 «Спецбуд» В. Я. Яраў. Расказаўшы аб жыццёвым шляху і дзейнасці тав. К. Т. Мазурава, ён заклікаў усіх выбаршчыкаў Мінскай гарадской першай выбарчай акругі 12 чэрвеня аднадушна аддаць свае галасы за кандыдатаў непарушнага блоку камуністаў і беспартыйных.

Выступае сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў БССР І. П. Шамякін.

— Дзень выбараў у Вярхоўны Савет СССР, — гаворыць ён, — заўсёды быў усенародным святам — святам сацыялістычнай дэмакратыі. І няма сумнення, што 12 чэрвеня гэтага года будзе такім жа святам, як і ранейшыя выбары. Не, я ўпэўнен, яшчэ больш урачыстым! Выбары будуць праходзіць у летні дзень, калі позірк людзей будзе лашчыць мора пасеваў на калгасных і саўгасных палях, а на лугах і ў нашых парках будуць палымнець кветкі, калі вуліцы будуць запоўнены дзятвой і моладдзю, расквечаны вясной, убраннем, шчасцем.

А самае галоўнае, што зробіць выбары вялікім святам, — гэта тое, што праходзяць яны неўзабаве пасля гістарычнага XXIII з'езда КПСС, рашэнні якога, Дырэктывы па пяцігадоваму плану выклікалі небывалы, сапраўды творчы ўздым усяго савецкага народа — рабочых, калгаснікаў, інтэлігенцыі. З'езд прадэманстраваў адзінства партыі камуністаў, правільнасць яе ленінскага курсу.

Тав. Шамякін характарызуе Кірылу Трафімавіча Мазурава як выдатнага партыйнага і дзяржаўнага дзеяча, які многія гады працаваў у нашай рэспубліцы і аддаваў усе свае сілы, веды і вопыт развіццю роднай Беларусі.

сказаў машыніст паравознага дэпо А. І. Ермалкевіч, — праходзіць пад знакам барацьбы за выкананне рашэнняў XXIII з'езда КПСС. Высокі палітычны ўздым, з якім рыхтуюцца савецкія людзі да выбараў, пераканаўча сведчыць аб тым, што народ горача падтрымлівае палітыку партыі, яе ленінскі курс, глыбока зацікаўлен у далейшым паляпшэнні дзейнасці Саветаў і ўсіх дзяржаўных органаў краіны.

Напярэдадні выбараў мы з гордасцю адзначаем, што калектыў нашага паравознага дэпо датэрмінова выканаў сямігодку і цяпер паспяхова працуе над выкананнем задач першага года пяцігодкі.

Сёння мы сабраліся на сустрэчу з нашым кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Савета СССР членам Палітбюро ЦК КПСС, першым намеснікам Старшыні Савета Міністраў СССР Кірылам Трафімавічам Мазуравым. Мы ведаем яго як вернага сына нашага народа, нястомнага барацьбіта за справу партыі.

Дарагія таварышы! Я заклікаю вас усіх у дзень выбараў аддаць свае галасы за вернага сына нашага народа і нашай партыі Кірыла Трафімавіча Мазурава.

На сходзе выступілі таксама прафесар Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна М. А. Жыдовіч, старшыня фабрычнага камітэта камвольнага камбіната Л. Н. Нагаўкіна, сакратар гаркома камсамола І. М. Пермякова. Яны цёпла адзываліся аб кандыдаце ў дэпутаты, гаварылі аб вялікім працоўным і палітычным уздыме, выкліканым падрыхтоўкай да выбараў, заклікалі ўсіх выбаршчыкаў 12 чэрвеня дружна прыйсці на выбарчыя ўчасткі і аддаць свае галасы за кандыдатаў блоку камуністаў і беспартыйных.

Цёпла сустрэты прысутнымі, з прамовай на сходзе выступіў кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Савета СССР член Палітбюро ЦК КПСС, першы намеснік Старшыні Савета Міністраў СССР К. Т. Мазураў.

Працоўныя горада Мінска, сказаў К. Т. Мазураў, аказалі мне высокае давер'е, вылучыўшы кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Савета СССР. Гэта давер'е я прымаю не як прызнанне маіх асабістых заслуг, а як выражэнне давер'я і павагі працоўных да Камуністычнай партыі, яе Цэнтральнага Камітэта. Што датычыць мяне, то я запэўніваю вас, што буду верна служыць роднаму народу і Камуністычнай партыі, як належыць камуністу.

Аўтарытэт партыі, яе натхняючыя ідэі, асененыя геніем вялікага Леніна, з'явіліся той жыватворнай творчай крыніцай, якая дала сілу савецкаму народу за найкарацейшыя тэрміны ліквідаваць разбуральныя вынікі другой сусветнай вайны і ўзняцца на вышыні, з якіх ужо адкрываюцца позірку камуністычныя далі.

Важнымі гістарычнымі падзеямі ў жыцці партыі і народа насычан перыяд, пройдзены з моманту мінулых выбараў у Вярхоўны Савет. Гэты перыяд характэрны глыбокімі эканамічнымі пераўтварэннямі, далейшым развіццём сацыялістычнай дэмакратыі, усталяваннем

праўднай навуковасці і строгай дзелавітасці. Асноўныя вяхі гэтых пераўтварэнняў пачынаюцца ад кастрычніцкага Пленума ЦК КПСС у 1964 годзе, праходзяць праз сакавіцкі і вераснёўскі Пленумы партыі ў 1965 годзе і падводзяць нас да XXIII з'езда Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, які вызначыў перспектывы развіцця нашай эканомікі на бліжэйшыя пяць гадоў.

Мінула крыху больш чым месяц пасля XXIII з'езда КПСС, але яго рашэнні ўжо аказваюць прыкметнае ўздзеянне на жыццё нашай краіны, мільёны савецкіх людзей з новай энергіяй разгортваюць барацьбу за выкананне распрацаванага партыяй новага пяцігадовага плана, іх натхняюць дасягненні мінулай сямігодкі, перспектывы бліжэйшых гадоў.

За мінулае сямігоддзе аб'ём прамысловай прадукцыі ў параўнанні з узроўнем 1958 года вырас на 84 працэнты, амаль падвоіліся асноўныя вытворчыя фонды народнай гаспадаркі, а нацыянальны даход, выкарыстаны на спажыванне і накапленне, узрос на 53 працэнты і дасягнуў 833 рублёў на душу насельніцтва.

Ва ўсім гэтым ёсць і дастойны ўклад працоўных Беларусі. Як прамысловасць, так і сельская гаспадарка Беларусі ў гэты перыяд развіваліся тэмпамі, якія апярэджваюць сярэднія тэмпы росту прамысловай і сельскагаспадарчай вытворчасці па краіне ў цэлым.

За гады сямігодкі ў краіне нямала зроблена для расшырэння вытворчасці тавараў народнага спажывання. Аднак патрэбнасці насельніцтва па многіх таварах народнага спажывання задавальняюцца яшчэ не поўнасцю. Мы ставім перад сабой гэту задачу, і ў нас ёсць магчымасці вырашыць яе ў недалёкім будучым.

Падвёўшы вынікі развіцця народнай гаспадаркі СССР за мінулыя сем гадоў, XXIII з'езд КПСС зацвердзіў Дырэктывы па плану 1966—1970 гадоў. У дакументах з'езда ўказана, што галоўную эканамічную задачу пяцігодкі партыя бачыць у тым, каб на аснове ўсямернага выкарыстання дасягненняў навукі і тэхнікі, індустрыяльнага развіцця ўсёй грамадскай вытворчасці, павышэння яе эфектыўнасці і прадукцыйнасці працы забяспечыць значны рост прамысловай вытворчасці, высокія ўстойлівыя тэмпы развіцця сельскай гаспадаркі і дзякуючы гэтаму дабіцца істотнага ўздыму ўзроўню жыцця народа, больш поўнага задавальнення матэрыяльных і культурных патрэбнасцей усіх савецкіх людзей.

Новая пяцігодка характэрна паскарэннем тэмпаў росту ўсёй народнай гаспадаркі, зблiжэннем тэмпаў развіцця галін, якія вырабляюць сродкі вытворчасці і прадметы спажывання пры захаванні апераджальнага развіцця першых. Гэта будуць гады тэхнічнага пераўзбраення ўсіх галін эканомікі, на аснове паскоранага росту тых галін вытворчасці, якія вызначаюць тэхнічны прагрэс.

На аснове высокіх тэмпаў развіцця матэрыяльнай вытворчасці і павышэння яе эфектыўнасці XXIII з'езд КПСС намеціў велізарную праграму сацыяльна-экана-

скарэння тэмпаў росту народнага дабрабыту.

Павелічэнне нацыянальнага даходу за пяцігоддзе на 38—41 працэнт забяспечыць рост рэальных даходаў у разліку на душу насельніцтва ў 1,3 раза. Сярэднегадавы прырост фонду спажывання падвоіцца і складзе 11 мільярдаў рублёў супраць 6,5 мільярда рублёў у мінулым пяцігоддзі.

З'езд дакладна вызначыў палітыку партыі ў выкарыстанні нацыянальнага даходу, канкрэтных форм і метадаў размеркавання матэрыяльных даброт. Прынцып аплаты па працы будзе і ў новай пяцігодцы рашаючым сродкам уздыму жыццёвага ўзроўню народа, важнейшым стымулам вытворчасці.

У новай пяцігодцы мінімум заработнай платы ўзнімецца да 60 рублёў у месяц, будуць паступова павышаны стаўкі і аклады рабочых і служачых з сярэдняй аплатай, што дасць магчымасць устанавіць больш правільныя суадносіны ў аплаце працы асобных катэгорый работнікаў. За пяцігоддзе рост сярэднемесячнай заработнай платы рабочых і служачых складзе ў сярэднім не менш як 20 працэнтаў, а грашовых і натуральных даходаў калгаснікаў ад грамадскай гаспадаркі—35—40 працэнтаў.

У новай пяцігодцы вялікія меры намячаюцца па далейшаму развіццю народнай асветы, культуры, аховы здароўя, жыллёвага будаўніцтва, сацыяльнага забеспячэння і бытавога абслугоўвання.

Высокімі тэмпамі будзе весціся жыллёвае і камунальнае будаўніцтва. Калі за пяць апошніх гадоў выдаткі дзяржавы на гэтыя мэты склалі 35 мільярдаў рублёў, то ў новай пяцігодцы будзе затрачана каля 45 мільярдаў.

Наша глыбокая ўпэўненасць у рэальнасці выканання заданняў пяцігодкі, сказаў далей тав. Мазураў, заснавана перш за ўсё на тым, што ў краіне створаны велізарныя вытворчыя магутнасці ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі, на новых магчымасцях, якія дае эканамічная рэформа, што праводзіцца ў краіне.

ЦК КПСС глыбока прааналізаваў недахопы, якія дапускаліся ў кіраўніцтве народнай гаспадаркай у мінулым. Сутнасць гэтых недахопаў — у недаацэнцы аб'ектыўных эканамічных законаў, у праяўленні валюнтарызму і суб'ектывізму, якія дапускаліся ў нас у апошнія гады. У выніку гэтага замарудзіліся тэмпы росту вытворчасці і прадукцыйнасці працы, знізілася эфектыўнасць выкарыстання вытворчых фондаў і капітальных укладанняў, а тэмпы росту нацыянальнага даходу аказаліся меншыя, чым было прадугледжана сямігадовым планам.

Каб пераадолець гэтыя недахопы, неабходна паслядоўна ўкараняць новыя прынцыпы эканамічнай палітыкі, распрацаваныя партыяй на сакавіцкім і вераснёўскім Пленумах ЦК КПСС. Гутарка ідзе аб узмацненні ролі эканамічных метадаў і стымулаў у кіраванні народнай гаспадаркай, аб карэнным паляпшэнні дзяржаўнага планавання пры расшырэнні гаспадарчай самастойнасці і ініцыятывы рэспублік, абласцей, прадпрыемстваў, калга-

тываў у дасягненні найлепшых вынікаў у інтарэсах усяго грамадства.

Для паскоранага развіцця прадпрыемстваў лёгкай, харчовай, хімічнай і іншых галін, якія выпрацоўваюць тавары шырокага ўжытку, за пяцігодку будзе выдзелена каля 15 мільярдаў рублёў капіталаўкладанняў — амаль у два разы больш, чым за папярэднія пяць гадоў.

Прадпрыемствы, якія вырабляюць тавары шырокага ўжытку, будуць тэхнічна пераўзброены на базе шырокага ўкаранення аўтаматычных, паточных ліній і іншага высокапрадукцыйнага абсталявання. Удвая павялічыцца вытворчасць сродкаў вытворчасці для гэтых галін прамысловасці, расшырыцца выпуск тавараў для насельніцтва на прадпрыемствах цяжкай прамысловасці, асабліва ў машынабудаванні і хіміі.

Тав. Мазураў падрабязна гаворыць затым аб мерапрыемствах, якія ажыццяўляюцца Камуністычнай партыяй і Савецкім урадам па далейшаму ўздыму ўсіх галін сельскагаспадарчай вытворчасці.

Валавая прадукцыя жывёлагадоўлі за год вырасла на 16 працэнтаў. Гадавы прырост грашовых даходаў калгасаў краіны ад рэалізацыі прадукцыі склаў каля двух з палавінай мільярдаў рублёў. На пятнаццаць працэнтаў вырасла за год аплата працы калгаснікаў.

XXIII з'езд адобрыў рашэнні сакавіцкага Пленума, надаў прынятай Пленумам ЦК КПСС сістэме эканамічных мер значэнне генеральнай лініі КПСС у галіне сельскай гаспадаркі.

У краіне намячаецца ажыццявіць шырокую праграму па арашэнню засушлівых зямель і па асушэнню пераўвільготненых угоддзяў, каб ураджаі на нашых палях не залежалі цалкам ад капрызаў надвор'я.

Прадугледжваецца павялічыць валавую прадукцыю сельскай гаспадаркі краіны за пяцігоддзе ў сярэднім на 25 працэнтаў. У вырашэнні гэтай агульнадзяржаўнай задачы шмат трэба зрабіць і працаўнікам сельскай гаспадаркі Беларусі.

Пяцігадовы план у галіне сельскай гаспадаркі таксама рэальны і, безумоўна, выканальны, як і ў галіне прамысловасці. Ён рэальны, перш за ўсё, таму, што кожны рубеж матэрыяльна падмацаван велізарнымі пастаўкамі ў сельскую гаспадарку тэхнікі, угнаенняў, электраэнергіі. Аб'ём капіталаўкладанняў у сельскую гаспадарку ў новай пяцігодцы складзе прыкладна 71 мільярд рублёў, што амаль удвая больш, чым у мінулай пяцігодцы.

Можна з поўнай падставай сцвярджаць, што цяперашняя пяцігодка будзе пяцігодкай эканамічнасці. Усё павінна быць падпарадкавана павышэнню **эфектыўнасці** вытворчасці — і тэхнічнае пераўзбраенне дзеючых прадпрыемстваў, і павышэнне якасці прадукцыі, і барацьба за найбольш эканамічныя праектныя рашэнні, і павышэнне аддачы вытворчых фондаў, і максімальнае скарачэнне страт і непрадукцыйных выдаткаў. Для вырашэння гэтых задач патрабуецца не толькі ўмелае навуковае кіраўніцтва гаспадаркай з боку партыйных, савецкіх і гаспа-

мас працоўных, настойлівая барацьба за эканомію і ашчаднасць.

Задача павышэння эфектыўнасці нашай гаспадаркі можа быць вырашана толькі агульнымі намаганнямі. А гэта значыць, што ўсім нам трэба намнога вастрэй, чым калі б там ні было раней, адносіцца да недахопаў гаспадарання ў вялікім і малым, рашуча ліквідоўваць іх.

Паскарэнне росту прадукцыйнасці працы — адна з карэнных задач новай пяцігодкі. Вырашаць яе трэба ў маштабе ўсёй краіны, кожнай рэспубліцы, кожнага прадпрыемства, на кожным рабочым месцы.

Да ліку прычын, якія тармозяць рост прадукцыйнасці працы, адносяцца: няпоўнае выкарыстанне абсталявання; высокая ўдзельная вага дапаможных рабочых і людзей, занятых ручной працай; зацягванне тэрмінаў асваення новых вытворчых магутнасцей; недастатковы ўзровень развіцця спецыялізацыі вытворчасці; нерытмічнасць і дрэнная арганізацыя працы на многіх прадпрыемствах; нізкі ўзровень нарміравання.

У зацверджаных XXIII з'ездам партыі Дырэктывах па новай пяцігодцы пастаўлена задача павысіць прадукцыйнасць працы ў прамысловасці на 33—35 працэнтаў. Для яе вырашэння спатрэбіцца як у цэнтры, так і на месцах зрабіць усе намаганні для таго, каб паскорыць укараненне дасягненняў навукі і тэхнікі ў народную гаспадарку, цалкам выкарыстоўваць наяўныя абсталяванне і машыны, ажыццяўляць меры па далейшай спецыялізацыі вытворчасці, палепшыць пастаноўку рамонтнай справы, нястомна ўдасканальваць арганізацыю і нарміраванне працы.

Вялікія рэзервы для паскарэння развіцця савецкай эканомікі ўскрывае цяперашняя гаспадарчая рэформа, падрыхтаваная ўсім ходам развіцця сацыялістычнай эканомікі. Формула, якая набыла цяпер прызнанне: «Тое, што выгадна грамадству, павінна быць выгадна кожнаму вытворчаму калектыву, кожнаму работніку» — гэта не проста прыгожая фраза. **Гэта сутнасць нашай палітыкі,** якая згуртоўвае ў адзіную сілу, адзіную волю аб'яднаныя матэрыяльныя і духоўныя інтарэсы мільёнаў працаўнікоў.

Цяпер, як ніколі раней, актуальна гучаць словы У. І. Леніна аб тым, што гаспадарчая справа ёсць самая цікавая для нас палітыка.

Таму ўсе нашы кіруючыя, інжынерна - тэхнічныя кадры абавязаны авалодваць эканамічнымі ведамі, вучыцца выкарыстоўваць эканамічныя законы ў інтарэсах развіцця вытворчасці, павышэння яе рэнтабельнасці.

Усё больш паслядоўнае і поўнае ўкараненне прынцыпаў гаспадарчага разліку ўзнімае на новую ступень і кааперавание вытворчасці. Парушэнні вытворчых сувязей, найменшая недакладнасць у кааператаваных пастаўках могуць звесці на нішто намаганні калектываў прадпрыемстваў працаваць па-новаму. Іменна таму барацьба за безумоўнае захаванне гаспадарчых дагавораў і дакладнае своечасовае выкананне ўзаемных абавя-

Побач з работай па ўдасканальванню кіраўніцтва эканомікай наша партыя ўдзяляе вялікую ўвагу камуністычнаму выхаванню савецкіх людзей, далейшаму ўдасканаленню нашага грамадства, расшырэнню савецкай дэмакратыі. Гэтыя пытанні былі ў цэнтры ўвагі XXIII з'езда КПСС.

З'езд падкрэсліў значэнне задачы далейшага развіцця марксісцка-ленінскай тэорыі, глыбокага навуковага аналізу заканамернасцей сучаснага ўнутранага і міжнароднага развіцця.

Узбагачаць сябе ведамі гісторыі партыі і нашай сацыялістычнай дзяржавы, ідэямі марксізма-ленінізма, палітычных праблем, выстаўленых з'ездам, павінен імкнуцца кожны член нашага грамадства, асабліва наша моладзь.

Выхаванне моладзі на гераічных, рэвалюцыйных, баявых і працоўных традыцыях нашай партыі і народа — адно з карэнных пытанняў дзейнасці Камуністычнай партыі і яе баявога памочніка — камсамола.

Наша мэта — выхоўваць у савецкіх людзей непахісную веру ў справядлівасць справы Камуністычнай партыі, рэвалюцыйную перакананасць, высокае ўсведамленне грамадскага абавязку, камуністычнай маралі, строгай і свядомай дысцыпліны.

І дасягнуць гэтай мэты можна толькі ў непрымірымай, паслядоўнай барацьбе супраць буржуазнай ідэалогіі і прапаганды, супраць апалітычнасці, прыватнаўласніцкіх перажыткаў і абывацельскіх настрояў, супраць любых праяўленняў утрыманскай псіхалогіі і нігілістычных адносін да народных ідэалаў і заваёў.

Наша Радзіма асвятляе шлях чалавецтва да прагрэсу не толькі сваім вопытам будаўніцтва эканомікі, свабоднай ад эксплуатацыі чалавека чалавекам, не толькі першым у гісторыі вопытам народаўладдзя, вопытам стварэння саюза і брацкай дружбы яе народаў.

Нязгасным святломззяюць для людзей працы ўсіх краін і кантынентаў духоўная прыгажосць савецкага чалавека, яго любоў да працы, мужнасць і стойкасць, высакароднасць і сумленнасць, вернасць саюзу са сваімі братамі па класу ва ўсім свеце, пралетарскі інтэрнацыяналізм.

Разумець усю глыбіню гэтай нашай місіі павінен кожны савецкі чалавек і паводзіць сябе адпаведна. Гэта надзвычай важна, бо ўсе мы жывём у свеце, дзе ідзе вастрэйшая барацьба паміж сіламі прагрэсу і рэакцыі, сіламі сацыялізма і імперыялізму, дзе разгортваюцца ўсё новыя класавыя рэвалюцыйныя бітвы.

Далей К. Т. Мазураў гаворыць аб некаторых пытаннях міжнароднага становішча Савецкага Саюза.

Суадносіны сіл у свеце няўхільна працягваюць мяняцца на карысць сацыялізма, рабочага і нацыянальна-вызваленчага руху, растуць прэстыж нашай краіны, яе ўдзельная вага ў свеце, яе ўплыў на рашэнне міжнародных праблем. Наша сацыялістычная дзяржава з першых дзён свайго існавання была верным сябрам і надзейнай апорай рэвалюцыйных сіл сучаснасці. Цяпер, калі Савецкі Саюз валодае велізарным эканамічным патэнцыялам, вялікай ваеннай магутнасцю.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы